# Трансфармацыя

У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" працуе выстава "ТРАНСФАРМАЦЫЯ. ДПМ-2010". Адметна, што яе адкрыццё стала, так бы мовіць, заключным акордам вялікай мастацкай "п'есы" — рэспубліканскай выставы сучаснага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Зямля пад белымі крыламі". Свае цудоўныя творы, як заўсёды, напоўненыя разняволенай фантазіяй, тут прадстаўляюць выпускнікі і студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Гэтая выстава — яшчэ адна нагода паразважаць, з чым ідуць у "дарослае" мастацтва сённяшнія маладыя беларускія творцы. А ідуць яны туды перадусім са сваімі талентам, пазітывам і бязмежным крэатывам, неад'емнымі ад імпэту маладосці. У выніку і атрымліваецца трансфармацыя — трансфармацыя акаляючай рэчаіснасці ў новую мастацкую рэальнасць, дзе могуць матэрыялізавацца нават такія рэчы, як музыка або палёт механічнай страказы...

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота аўтара.**


Марыя Барысенка (выпускніца БДУКіМ). З серыі "Саксафон (матэрыялізацыя музыкі)".


Таццяна Гомза (выпускніца БДПУ імя Максіма Танка). З серыі "Стракоптыка". Страказа № 4.


Вольга Мешчаракова (студэнтка БДУКіМ). "Пчаліная сям'я".


Дзяніс Барсукоў (выпускнік БДУКіМ). "Generation Next, Next".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ